**Л. І. Прозарава (Мазыр, Беларусь)**

# ВОБРАЗНАЕ АСЭНСАВАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ Ў ТЭКСТАХ-УВАСАБЛЕННЯХ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКІХ АЎТАРАЎ)

Адным з самых выразных сродкаў вобразнасці з'яўляецца ўвасабленне. Паводле агульнапрынятага вызначэння **ўвасабленнем** мы называем перанясенне чалавечых рыс ці ўвогуле рыс жывых істот на неадушаўлёныя прадметы і з'явы. Вытокі гэтага тропа бяруць свой пачатак яшчэ ў вуснай народнай творчасці. "Для людзей глыбокай даўніны быў характэрны сінкрэтызм вобразнага і фізіялагічнага асэнсавання рэчаіснасці, які заключаўся ў тым, што натуралістычнае ўспрыманне пэўнай рэаліі цесна перапляталася з мастацкай фантазіяй" [1, 122]. Гэты троп выступае як сродак паэтызацыі, стварэння сімвалічных вобразаў, павышэння мастацкасці, адухаўлення з'яў прыроды, рэчаў, якія надзяляюцца здольнасцю адчуваць, думаць, дзейнічаць. Увасабляцца могуць асобныя характарыстыкі, пачуцці і ўласцівасці, абстрактныя паняцці, якія ў рэальнасці зусім не маюць прадметнай асновы, а набываюць яе ў выніку ўвасаблення.

Некаторыя аўтары правамерна лічаць увасабленне "прыватным праяўленнем метафары" [2, 30]. І з гэтым трэба пагадзіцца, таму што ўвасабленне адпавядае метафарычнай мадэлі "асоба – неасоба". Вывучэнне дадзенага сродка вобразнасці ўяўляе асаблівую цікавасць на ўзроўні тэксту. Увасабленне як троп часта вывучалася літаратуразнаўцамі, і радзей прыцягвала ўвагу лінгвістаў. А. А. Ціхаміравай належыць адна з апошніх прац, прысвечаных гэтай праблеме, дзе ўвасабленне разглядаецца на матэрыяле асобных тэкставых фрагментаў [3]. У сучасным мовазнаўстве амаль адсутнічаюць працы, у якіх увасабленні разглядаюцца на ўзроўні цэлага паэтычнага тэксту. Між тым гэты троп вельмі часта з'яўляецца тэкстаўтваральным.

Мэта нашага даследавання – паказаць некаторыя галоўныя накірункі вобразнага асэнсавання ў тэкстах адзначанага тыпу. Матэрыялам для даследавання з'явіліся тэксты аўтараў, у ідыястылях якіх прыём увасаблення з'яўляецца найбольш адметным. Гэта такія беларускія паэты, як Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Вялюгін, А. Пысін, П. Панчанка і інш.

Праведзены аналіз паказаў, што ў творах беларускіх паэтаў прадметамі (рэферэнтамі) параўнання з'яўляюцца: ***"паняцці, звязаныя з назвамі расліннага свету"*** (*бор, чарот, ясень, аер, асіна, бяроза, дуб, крапіва, яблыня*), ***"паняцці, звязаныя са стыхійнымі з'явамі прыроды"*** (*гром, сівер, туман, пярун, мароз, лівень, дождж*), ***"паняцці, звязаныя з воднай паверхняй"*** *(рака, возера, ручай, азярына, мора, вада, плёс)*, ***"паняцці, звязаныя з назвамі месяцаў"*** (*чэрвень, ліпень, сакавік, май*), ***"паняцці, звязаныя з прамежкамі часу, абстрактнымі назвамі"*** *(час, лёс, адчай, ісціна, душа, маладосць, старасць)*, ***"паняцці, звязаныя з краінамі, населенымі пунктамі, жыллём"*** (*Беларусь, інтэрнат, дом, Варшава*), ***"паняцці, звязаныя з порамі года"*** *(восень, зіма, лета, вясна)*, ***"паняцці, звязаныя з нябеснымі свяціламі"*** *(сонца, поўня, зоркі, месяц)*, ***"паняцці, звязаныя з паэтычнай творчасцю"*** *(песня, мова)*.

Сярод разгледжаных паэтычных твораў найбольш распаўсюджаны такія, рэферэнты якіх адносяцца да першых трох з названых семантычных груп: увасабленне паняццяў расліннага свету, стыхійных з'яў прыроды, воднай паверхні. Так як у дадзеным артыкуле мы не маем магчымасці разгледзець усе прыклады, то спынімся толькі на тых, што адносяцца да ўвасабленняў паняццяў прыроды.

Так, у складзе выдзеленай групы ў якасці тэкстаўтваральнага рэферэнта часта выступаюць наступныя лексемы: ***вецер*** (Р. Барадулін "Балада пра маці", "Сталасці пара", "Перадзім'е", П. Броўка "Асенні вецер"), ***гром*** (А. Вялюгін "Дождж", Р. Барадулін "Станцыя Грамы", "Спякота"), ***дождж*** (Г. Бураўкін "Дождж", Р. Барадулін "Паштоўка да маці", У. Камейша "Малюнак начнога дажджу"), ***хмара*** (А. Вялюгін "Дождж", Р. Барадулін "Б'е пярун прамой наводкай...", В. Макарэвіч "Навальніца"), ***мароз*** (П. Панчанка "Зімні вечар…") і інш.

Разгледзім прыём увасаблення на ўзроўні рэалізуемай у тэксце прэдыкацыі. Перш за ўсё заўважым, што да разумення тропа мы падыходзім шырока, бачым у ім вобразную адзінку, прырода якой зводзіцца да перасячэння сэнсаў на ўзроўні лексічнай семантыкі, граматыкі і сінтаксісу.

Існуе вядомая каардынацыя паміж характарам прэдыкацыі і прыналежнасцю рэферэнтаў да пэўных семантычных груп. Аднак у дадзенай тэматычнай групе адсутнічае відавочна выражаная замацаванасць семантычна аднародных прэдыкатаў за рэферэнтамі. Так, пры аналізе твораў беларускіх аўтараў намі было заўважана, што ў тэкстах з рэферэнтамі адной тэматычнай групы, кола семантычных характарыстык выглядае дастаткова пашырана. Найбольш распаўсюджаны прэдыкаты-характарыстыкі "неасоб" з боку:

**знешнасці**, характэрнай для чалавека: *А хмары зноў / Ідуць здалёк са сваркаю / У світцы палатнянай і даўгой* (В. Макарэвіч); *У кірзачы абутыя, / У полі й між лазы / Са скрыпам ходзяць лютыя / У лютым маразы… / І хітра пасміхаюцца / У доўгія вусы* (В. Макарэвіч);

**прыналежнасці да пэўных прафесій, роду дзейнасці:** *Стаміўся вецер-паштальён, / Павандраваў з пісьмом багата, / Пакуль убачыў адрасата* (М. Маляўка); *Мароз – мастак* (А. Пысін); *Плылі над пасёлкам / Хмар караблі, / І ў рэйс вялі іх / Вятры-капітаны* (П. Броўка);

**узросту:** *Смычкоў суладны унісон / З размаху, наўскасы / Ударыў – і вясновы дождж / За хмаркаю ўслед / Пабег, як хлопчык, басаног / У ясны мілы свет, / Не разбіраючы дарог* (В. Вітка "Верасы"); *Мароз стары…*(Р. Барадулін);

**рыс характару, ацэначнай характарыстыкі:** *Бачыш, як вясёлая мяцеліца / Сёння ў ход пусціла памяло! / Маладая, / Шустрая, / Нязвычная / Так імчыцца – / Следу не відно. / Пухкаю, бялюткай рукавічкаю / Ненахабна стукае ў акно* (Р. Рэлес) і інш.

Рэферэнтам-неасобам у тэкстах часта прыпісваюцца і характарыстыкі **па дзеяннях, учынках, думках** і г. д.: *Хмарка задумалася, схамянулася, даганяе іх [хмаркі], худнее ад страху, ад роспачы…* (Р. Барадулін); *Навальніца хацела скрывіцца, / Ды пазяхнула / аж вывіхнула сабе / Сківіцу навальніцы* (Р. Барадулін); *Дробны дождж над вадой тчэ сівыя радкі* (Н. Арсеннева). Часам такія персанажы надзяляюцца і моўнай здольнасцю: *Вецер сонца ў поле гоніць – / Са сняжынкамі гамоніць. / І бярозу сцюжа гоніць. / Ды пра венікі гамоніць. / Шэпча снег з-пад палазка – / З-пад кляновага вазка* (С. Гаўрусёў). Так як з'явам прыроды прыпісваюцца характэрныя прыкметы людзей, то і персаніфікацыя ў тэкстах гэтай групы часта сумяшчаецца з метанімізацыяй.



МГПУ им. И.П. Шамякина

У беларускай паэзіі сярод тэкстаў-увасабленняў значнае месца належыць полірэферэнтным, дзе ў ролі персанажаў выступаюць адразу некалькі “неасоб”. Так, у вершы Р. Барадуліна “Зазімак” перад намі ўяўляюцца адразу чатыры персанажы-неасобы, надзеленыя рознымі чалавечымі якасцямі: вецер, які як дворнік расчышчае вуліцы (дзеянне), мароз, што “здароўкаецца палка” (гаварэнне), зіма тупае, нібы старая жанчына (дзеянне, якасная ацэнка), а маладыя ліпы сціскаюць у кулачкі лісце...

Такім чынам, аналіз тэкставага матэрыялу паказаў, што прыём увасаблення, які рэалізуецца на ўзроўні цэлых тэкстаў, носіць дастаткова сістэмны і мадэліраваны характар. Гэта выражаецца ў наяўнасці лексічных груп, якія належаць да пэўных семантычных абласцей і выступаюць у якасці тэкставых рэферэнтаў. Спосабы ўзнікнення тропавасці ў тэкстах-увасабленнях адзначаюцца вялікай разнастайнасцю, што стварае яе розныя градацыі. Даследаваны матэрыял паказаў, што найбольш часта паняцці прыроды, зямной паверхні, расліннага свету і г. д., характарызуюцца з боку рыс, характэрных для чалавека: знешнасці, узросту, прыналежнасці да пэўнай прафесіі, роду дзейнасці і інш.

**Літаратура**


1. Тайлор, Э. Б. Первобытная культура / Э. Б. Тайлор. – М.: Политиздат, 1989. – 573 с.
2. Старычонак, В. Д. Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў) / В. Д. Старычонак. – Мінск: БДПУ, 1997. – 232 с.
3. Тихомирова, Е. А. Лингвистический анализ тропа: метафора-олицетворение в русских и белорусских поэтических текстах начала XX века: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01; 10.02.02 / Е. А. Тихомирова; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1991. – 22 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина